


**Арына САМАРКІНА,**
вучаніца 9 “А” класа СШ №6,
г. Смаргонь, Гродзенскай вобласці.

## Солы і Ашмянка

**Ёсць на Смаргоншчыне шмат цікавых паданняў пра паходжанне вёсак і рэчак, азёр і курганоў. Аднойчы я спыталася ў сольскай бабулі, адкуль назва “Солы”? Пра тое яна ведала даўнюю легенду. І распачала мне апавядаць. А я хачу падзяліцца з іншымі, таму перакажу, як запомніла.**

Даўным-даўно ў гэтай мясцовасці жыў вельмі дужы і смелы юнак. Імя яму было Солах. Быў ён працавіты, прыгожы, праўдзівы. Заўжды бараніў слабейшых, праўду казаў у вочы. Не ўзлюбіў мясцовы пан смелага і шчырага юнака і абклаў яго такімі падаткамі, што немагчыма было сплаціць іх і за сорак гадоў, а не тое што за адну восень. Загадаў злы пан кінуць Солаха ў вязніцу. Спецыяльна яго не кармілі, вады яму не давалі, каб загубіць юнака.

Прайшло некалькі дзён, тыдняў, пан пытаецца ці не сканаў юнак у вязніцы. Яго служкі адказваюць, што жыў-здароў Солах, нават не пахудзеў. Пачакаў пан яшчэ колькі тыдняў, ізноў пытаецца, ці жывы Солах. Варта адказвае:

“Жчывы, жывы! Сядзіць песні спявае, жарты апавядае, есці і піць не просіць.” Узлаваўся пан, пайшоў сам паглядзець, ці праўду кажуць яго служкі. Аж бачыць, сапраўды, Солах вясёлы, задаволены, нават яшчэ лепш выглядае, чым раней. Загадаў тады пан назіраць за вязніцай Солаха днём і ноччу.

Калі лягла на зямлю начная імгла, замоўклі птушкі, толькі голас пугача раз-пораз з багны чуўся, паснула і варта. Але не спаў злосны пан. Ён згледзеў, што нечы цень аддаліўся ад палаца і хуценька падаўся да вязніцы. Крыху пачакаўшы, пайшоў і пан следам. Нападыходзе пачуў ён галасы юнака і дзяўчыны. Яны перашэптваліся і ціхенька смяяліся. Уварваўся разгневаны пан да свайго нявольніка і бачыць: там яго любімая дачка Ашмяна прынесла ежу і пітво для юнака. Здагадаўся валадар мясцовы, хто пайшоў супраць яго волі і розум ад нянавісці страціў. Загадаў забіць і юнака і сваю адзіную дачку. А пра месца пахавання нікому не расказалі.

Але мясцовы люд памятаў заўжды пра бязвінна загубленыя маладыя душы, таму і называлі ў іх гонар паселішча Солы, а рэчку, што тут бяжыць Ашмянка. Гэтыя назвы праз стагоддзі і пасёння захаваліся, разам з паданнем пра дабрыню і нянавісць, спагадлівасць і хцівасць, чыстыя сэрцы і чорную зайздрасць.